Гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная
сістэма г. Гродна;
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу
Цэнтральнай бібліятэкіімя А. Макаёнка

# Наш знакаміты паэт

## Сцэнарна-метадычныя матэрыялы да 60-годдзя з дня нараджэння Юркі Голуба

2007

**20 кастрычніка 2007 года спаўняецца 60 гадоў знакамітаму гродзенскаму паэту Юрыю Уладзіміравічу Голубу. Многа гэта ці мала? Здаецца, што не вельмі шмат, але за сваё жыццё гэты нястомны, энергічны чалавек паспеў зрабіць вельмі многа: выдзадзена адзінаццаць зборнікаў вершаў, 25 гадоў плённай працы на аблтэлерадыё, рэдакцыі газеты “Гродзенская праўда”.**

**Юрка Голуб – паэт ад Бога, які стварыў свой верш – лаканічны, адметны інтанацыяй, вобразамі, унутранай рыфмоўкай. Смелыя, парадаксальныя метафары раскрываюць шчодрасць і энэргію лірычнага перажывання, рамантычны лад душы, здольнасць адчуваць паўнакроўнасць жыцця, яго магутны пульс.**

**Дадзенае біябібліяграфічнае выданне падрыхтавана па матэрыялах крытычных і біяграфічных артыкулаў, створана і выдадзена сіламі ўдзячных бібліятэкараў Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А. Макаёнка, як падарунак чытачам бібліятэкі, бібліятэкарам і паважанаму Юрке Голубу ў гонар яго юбилею.**

# БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА



**З Пегасам з зэльвенскага жолаба**
**П’юць халадзёнку вершы Голуба.**
**Як вып’юць – Нёман пад рукой:**
**Няма праблем з такой ракой!**

***Рыгор Барадулін***

Хараство зямлі Зэльвенскай адкрыла скарбонку таленту Юркі Голуба. Яшчэ з дзяцінства пяшчота бацькоў і напеўнасць роднай мовы не далі загаснуць загарэўшайся паэтычнай іскрынцы.

Юрый Уладзіміравіч Голуб паходзіць з сялянскай сям’і з вёскі Горна Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці. Нарадзіўся ён 20 кастрычніка 1947 года. Бацька быў краўцом, спраўна абшываў усю акругу, а таму ў хаце “варочалася шмат люду – ад раённага начальства да вясковага дзядзькі-гаваруна”. З ранняга дзяцінства чуў хлопчык безліч цікавых жыццёвых гісторый, здарэнняў “усур’ёз і жартам, з выдумкай і салёным слаўцом, а падчас і з песняй”.

Вучыўся ў пачатковай школе вёскі Горна (1954-1958гг.), затым у Зэльвенскай сярэдняй школе (1958-1965гг.). Яшчэ ў школьныя гады прызвычаіўся рабіць допісы ў газеты, потым вершы. У раённым друку ў 1963 годзе з’яўляецца яго першы верш “Хто не працуе…”.

Пасля заканчэння Зэльвенскай сярэдняй школы ў 1965 годзе Юрка Голуб паступіў на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Леніна. Выкладчыкамі універсітэта былі вядомыя

паэты і пісьменнікі, што спрыяла развіццю паэтычных здольнасцей шчырага і дапытлівага юнака. У гады вучобы ён удзельнічаў у рабоце універсітэцкага літаб'яднання “Узлёт” пад кіраўніцтвам А. Лойкі.

З 1965 года Юрка Голуб друкуецца ў рэспубліканскім друку. Выданнем яго першага зборніка паэзіі “Гром на зялёнае голле” азнаменаваўся 1969 год. Вельмі імкліва ён увайшоў у паэзію. Адметнасць паэзіі Юркі Голуба была заўважана адразу – тады ж, у канцы 60-х, бласлаўлёны самой Ларысай Геніюш, ён адразу “прымусіў” крытыку прызнаць, што “яго погляд на свет не зблытаеш ні з чыім іншым” (Ф. Яфімаў). Вершы Голуба вызначаліся экспрэсіўнасцю радка, яркай метафарызацыяй, багатай рыфмоўкай. “Пачуццё даверу да старэйшых, да тых, хто быў ахоўнікам твайго лёсу, - вось гэта пачуццё здаецца мне дамінуючым у першай кнізе Юркі Голуба”, - пісаў А. Лойка.

Закончыўшы філфак БДУ ў 1970 годзе, Юрый Уладзіміравіч жыве і працуе ў Гродна. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1971 года. Спачатку працаваў рэдактарам у рэдакцыі літаратурна-музычных перадач на Гродзенскай студыі тэлебачання. З 1975 года з'яўляецца літаратурным кансультантам рэдакцыі газеты “Гродзенская праўда”, дзе працуе ў аддзеле культуры і навукі. З 1979 года - загадчык аддзела мастацкага вяшчання аблтэлерадыё, вядзе на абласной студыі тэлебачання штомесячную перадачу “Гродзеншчына літаратурная”, у якой знаёміць гледачоў з творчасцю пісьменнікаў-землякоў, з маладымі літаратарамі.

Паэтычная творчасць Юркі Голуба працягваецца. Вершы яго вызначаюцца мяккім задушэўным лірызмам, уменнем адчуваць паўнакроўнасць жыцця. Выходзяць яго кнігі вершаў “Дрэва навальніцы” (1970), “Векапомнае поле” (1976), “Помню пра цябе” (1983), “Сын небасхілу” (1989).

Не пакінуў без увагі Юрый Уладзіміравіч і маленькіх жыхароў краіны. “У бары грыбы бяры” – пад такой назвай у 1986 годзе выйшаў зборнік вершаў для дзяцей.

У 2001 годзе выдаецца кніга вершаў “Поруч з дажджом”, якая ўключае і вершы пра сваю малую радзіму. Напрыканцы 2002 года ў выдавецтве “Беларускі кнігазбор” выйшаў зборнік трыялетаў “Зажураны камень”, як прызнаецца ў прадмове сам аўтар, - “пад уладным заклікам Максіма Багдановіча”.

У 2004 годзе выйшаў зборнік вершаў “Брама зімы”. Гэта адна з самых прыкметных кніг у сучаснай беларускай паэзіі. У зборніку надрукавана паэма нацыянал-патрыятычнага гучання “Знакі”. Апошняя кніга паэзіі Юркі Голуба “Багра” выйшла ў 2006 годзе. Айчына, мова, вера, патрыятызм, працалюбства, любоў і дабро – вось асноўныя складнікі яго творчай планіды.

Творчасць Юркі Голуба вядома не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, але і за яе межамі. Асобныя творы перакладаліся на рускую, украінскую, літоўскую, польскую, нямецкую, славацкую мовы. А ў 2006 годзе, у Беластоку, была выдадзена кніга вершаў Ю. Голуба на польскай мове «Znad Niemanskich Stron» - гэта пераклад вершаў са зборніка “Поруч з дажджом”.

За заслугі ў паэзіі Юрый Уладзіміравіч у 2000 годзе ўзнагароджаны літаратурнай прэміяй імя А. Куляшова.

З мая 2003 года з’яўляецца старшынёй Гродзенскага абласнога аддзялення грамадскага аб’яднання “Саюза беларускіх пісьменнікаў”.

“Юрка Голуб – паэт не ад абазнанасці ў розната кшталту літаратурных хітрыках, паэт не ад універсітэцкага філфаку, дзе паспяхова навучыліся рыфмаваць дзесяткі вершапісцаў. Ён паэт ад неба,

паэт ад Яе Высокасці Радзімы”, - напісаў у артыкуле пра Юрку Голуба пісьменнік Міхась Скобла.

Добры, жыццядайны і арыгінальны талент дадзены Юрку Голубу, якога чакаюць новыя дарогі, адкрыцці і паэтычныя знаходкі.



# БІБЛІЯГРАФІЯ

## Творы Юркі Голуба




Голуб, Ю. Гром на зялёнае голле: вершы / Юрка Голуб. - Мінск: Беларусь, 1969. - 64 с. - (Сер. “Першая кніга паэта”).




Голуб, Ю. Дрэва навальніцы: лірыка / Юрка Голуб. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1973. - 80 с.




Голуб, Ю. Векапомнае поле: вершы / Юрка Голуб. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. - 64 с.




**Голуб, Ю. Помню пра цябе: вершы / Юрка Голуб. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1983. - 62 с.: іл.**




**Голуб, Ю. Сын небасхілу: вершы / Юрка Голуб. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1989. - 142 с.**



**Голуб, Ю. Поруч з дажджом: вершы / Юрка Голуб. - Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. - 164 с.**




**Голуб, Ю. Зажураны камень: трыялеты / Юрка Голуб. - Мінск: Беларускі кнігазбор, 2002. - 68 с.**




**Голуб, Ю. Брама зімы: кніга паэзіі / Юрка Голуб. - Мінск: Мастацкая літаратура, 2004. - 119 с.**




**Голуб, Ю. Багра: кніга паэзіі / Юрка Голуб. - Мінск: Беларускі кнігазбор, 2006. - 225с.**




**Голуб, Ю. У бары грыбы бяры: вершы [для дзяцей] / Юрка Голуб. - Мінск: Юнацтва, 1986. - 16 с.**




**Holub, J. Znad Niemenskich Stron / Jurka Holub. - Bialostok: Ksiaznica Podlaska im. Lukasza Gornickiego, 2006. - 72 s.**

# Літаратура аб жыцці і творчасці Юркі Голуба

**Голуб Юрка // Бел. энцыкл.: у 18 т. – Мінск,1997. - Т. 5. - С. 326.**

**Голуб Юрка // Энцыкл. літ і маст. Беларусі. - Мінск, 1985. - Т. 2. - С. 111.**

**Юрка Голуб // Беларускія пісьменнікі (1917-1990): даведнік. - Мінск, 1994. - С. 147.**

**Голуб Юрка // Беларускія пісьменнікі: біябіблягр. слоўн. - Мінск, 1994. - Т. 2. - С. 232-235.**

**Голуб Юрка // Памяць: Гродна. - Мінск, 1999. - С. 642.**

**Алексіевіч, С. "Пра сувязь зоркі і травы..." / С. Алексіевіч // Знамя юности. - 1973. - 16 сент.**

**Баравікова, Р. Душы акрыленай размова / Р. Баравікова // ЛіМ. - 1983. - 28 кастр. - С. 6-7.**

**Бичель-Загнетова, Д. Возвыситься к слову / Д. Бичель-Загнетова // Гродненская правда. - 1983. - 20 авг. - С. 4.**

**Гайдук, Л.К. Скарбонка таленту паэта /Л.К. Гайдук // Славуты Зэльвенскі край. - Ліда, 2004. - С. 331-332.**

**Генька, М. "Над Нёманам пад небам" / М. Генька // Праца (Зэльв. р-н). - 2001. - 18 снеж. - С. 4.**

**Гірская, Л. Стыпендыі Міністэрства - дзеячам культуры / Л. Гірская // Гродзенская праўда. - 2001. - 27 студз. - С. 3.**

**Голуб, Ю. Прыгоды Юркі Голуба з Аркадзем Куляшовым / Ю. Голуб // Пагоня (Гродна). - 2001. - 1 лют. - С. 5.**

**Дожын, А. Першая ластаўка / А. Дожын // Праца (Зэльв. р-н). - 1969. - 30 снеж.**

**Жук, І. Над Нёманам пад небам / І. Жук // Праца (Зэльв. р-н). - 1997. - 25 лістап. - С. 2.**

**Жук, І. Паэт пазнаецца па многім // Гродзенская праўда. - 1997. - 18 кастр. - С. 4.**

**Жук, І. Юрка Голуб: вяртанне ў трыялет // Роднае слова. - 2006. - №5. - С. 21-25.**

**Королёв, Н. Над просторами колыхаться... / Н. Королёв // Гроднская правда. - 1976. - 23 июля.**

**Королёв, Н. Радостное сравнение / Н.Королёв // Гроднская правда. - 1973. - 7 авг.**

**Коўтун, В. Здабыткі і страты польнай сяўбы / В. Коўтун // Полымя. - 1976. - №11. - С. 239-242.**

**Лайкоў, Я. Сын небасхілу / Я. Лайкоў // ЛіМ. - 2004. - 24 снеж. - С. 6.**

**ЛеГАЛ. Юрка Голуб. Багра / Леанід Галубовіч // ЛіМ. - 2007. - 5 студз. (№1). - С. 16.**

Лойко, О. Живому слову рад / О. Лойко // Нёман. - 1970. - №11. - С. 171-172.

Мазго, У. Вершы Юркі Голуба / У. Мазго // Праца (Зэльв. р-н). - 1976. - 8 чэрв.

Марціновіч, А. Ні кроку ад Радзімы / А. Марціновіч // Маладосць. - 2001. - №12. - С. 239-244.

Марціноўскі, П. Юрку Голубу – 50 / П. Марціноўскі // Праца (Зэльв. р-н). - 1997. - 21 кастр. - С. 2.

Навуменка, І. ...Прачытала вершы земляка: верш, прысвечаны Ю. Голубу / І. Навуменка // Праца (Зэльв. р-н). - 2003. - 17 чэрв. - С. 2.

Нікіпорчык, А. Поруч з даждом / А. Нікіпорчык // Вечерний Гродно. - 2002. - 23-30 окт. - С. 3.

Нікіпорчык, А. Узнясенне да слова / А. Нікіпорчык // Полымя. - 2005. - №2. - С. 203-210.

Павлёнок, И. Избран новый секретарь организации Союза писателей / И. Павлёнок // Газ. Слонім. - 2003. - 29 траўня. - 4 чэрв. - С. 5.

Пацэнка, М. Пясняр Прынямоння / М. Пацэнка // Гродзенская праўда. - 1997. - 18 кастр. - С. 4.

Пацэнка, М. Пясняр Прынямоння / М. Пацэнка // Праца (Зэльв. р-н). - 1997. - 21 кастр. - С. 2.

Пацюпа, Ю. Квяцістае покрыва для штодзённасці: пра паэтыку Юркі Голуба / Юры Пацюпа // Роднае слова. - 2007. - №9. - С. 8-9.

Петравец, А. Прызнанне сыноўняга сэрца / А. Петравец // Звязда. - 1973. - 22 вер.

Петрушкевіч, А. "Да жыта лёсам прычыніцца..." / А. Петрушкевіч // Гродзенская праўда. - 2002. - 17 снеж. - С. 3.

Петрушкевіч, А. Акрэслены абсяг / А. Петрушкевіч // Праца (Зэльв. р-н). - 2003. - 14 студз. - С. 2.

Прокопчик, М. Над землёй, над белыми крыльями / М. Прокопчик // Заветы Ильича. - 1977. - 22 нояб. - С. 5.

Пысін, А. Узыходжанне / А. Пысін // Полымя. -1974. - №1. - С. 236-239.

Пяткевіч, А. "І далёкае – блізкае..." / А. Пяткевіч // Праца (Зэльв. р-н). - 1997. - 21 кастр. - С. 2.

Пяткевіч, А. Сын небасхілу / А. Пяткевіч // Гродзенская праўда. - 2005. - 11 студз. - С. 3.

Пяткевіч, А.М. Майстэрства паэтычнага слова / А.М. Пяткевіч // Старонкі спадчыны. - Мінск, 2006. - С. 142-145.

Разбудзіў трывогу трыялет // ЛіМ. - 2002. - 6 снеж. - С. 6.

Сабасцян, А. Сын Нёмана і Зяльвянкі / А. Сабасцян // Зара над Нёманам (Мастоўскі р-н). - 1998. - 21 студз. - С. 3.

Свірка, Ю. Урокі другой кнігі / Ю. Свірка // Маладосць. - 1974. - №1. - С. 174-178.

Скобла, М. “Пад сэрцам у Радзімы...” / М. Скобла // Праца (Зэльв. р-н). - 1997. - 24 снеж. - С. 4.

Скобла, М. “Пад сэрцам у Радзімы...” / М. Скобла // Дзярэчынскі дыяруш. - Мінск , 1999. - С. 203-208.

Скобла, М. ”Пад сэрцам у Радзімы...”: крэскі на юбілейным подыуме Юркі Голуба / М. Скобла // Роднае слова. - 1997. - №10. - С. 168-182.

Трушко, М. Зазіранне ў вочы веку / М. Трушко // Маладосць. - 1970. - №5. - С. 119-121.

Чарняўскі, М. Любоў да роднага поля / М. Чарняўскі // Беларусь. - 1977. - №8. - С. 26.

Чыгрын, С. Кніга трыялетаў / С. Чыгрын // Газ. Слонім. - 2002. - 24-30 кастр. - С. 13.

Чыгрын, С. Прэмія за паэзію / С. Чыгрын // Газ. Слонім. - 2001. - 1-7 лют. - С. 2.

Чыгрын, С. Трыялеты ад Юркі Голуба / С. Чыгрын // Ніва. - 2002. - 3 лістап. - С. 5.

Шаўчонак, М. Пра паэта і сябра / М. Шаўчонак // Аркуш. - 1997. - 23-29 кастр. (№42). - С. 2.

Шлык, М. Непаўторныя роспісы дня / М. Шлык // Праца. - 1976. - 9 кастр.

Шматко, Я. Прэм’ера новай кнігі Юркі Голуба / Я. Шматко // Праца (Зэльв. р-н). - 2002. - 26 сак. - С. 2.

Юрка Голуб. “Брама зімы” / Юрка Голуб // Гродзенская праўда. - 2005. - 18 лют. - С. 16.

Юрку Голубу – 50 // ЛіМ. - 1997. - 17 кастр. (№429). - С. 12.

Ярац, В. Выспяванае слова / В. Ярац // Беларусь. - 1984. - №6. - С. 33.

Яфімаў, Ф. Здабыткі і страты / Ф. Яфімаў // Беларусь. - 1974. - №8. - С. 26-27.

## Вершы, прысвечаныя Юрку Голубу

Сливко, С.Ф. Юрий Голуб: поэту Ю. Голубю: стихотворение / С.Ф. Сливко // Прощай, двадцатый век: стихи. Юмор. Проза. - Лида, 2001. - С. 10-11.

Янішчыц, Я. «Ці чуецца ў зманлівым спакоі...»: верш / Я. Янішчыц // Пара любві і жалю. - Мінск, 1983. - С. 124.

Ярац, В. На фінішы лета: верш, прысвечаны Ю. Голубу / В. Ярац // Крыніца. - 2003. - №11-12. - С. 41.

# "Пясняр Прынямоння"

## Сцэнарый вечара-партрэт, прысвечанага 60-годдзю Юркі Голуба

*У чытальнай зале бібліятэкі – партрэт Ю.У. Голуба, юбілейная выстаўка літаратуры, восеньскія кветкі. Гучыць беларуская народная музыка.*

**Вядучы 1:**

*Крылатае бацькава*
*прозвішча –*
*Найлепшая спадчына*
*сыну,*
*Я ў калысцы ляжаў*
*яшчэ*
*І лапатаў крылом*
*галубіным!*

Нарадзіўся Юрый Уладзіміравіч Голуб 20 кастрычніка 1947 года ў вёсцы Горна Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці.

**Вядучы 2:**

Вышыня была наканавана яму ад нараджэння – вёска Горна, прозвішча Голуб. Раўнінная Зэльвеншчына тысячы гадоў захоўвала ад выветрывання і размывання ледавіковую спадчыну – некалькі стромістых пагоркаў, - каб у трэці пасляваенны год клапатліва падставіць плячо падлётку. З узвышэння, як вядома, лягчэй узлятаць. Ды і галубінае прозвішча, думаецца, было абрана невыпадкова.

**Вядучы 1:**

Юрый Уладзіміравіч успамінае: “У сям’і было тры сыны, і яе так званы ўклад жыцця на тыя часы можна было б лічыць тыпова сялянскім, каб не адна акалічнасць. Справа ў тым, што бацька мой быў краўцом, і гэта наклала свой адбітак на дзіцячыя ўражанні.  У нашай хаце былі свежыя людзі: ад раённага начальства да вясковага дзядзькі-гаваруна, якіх бацька спраўна і не без поспеху абшываў. Тут можна было пачуць безліч жыццёвых гісторый, здарэнняў, пагудак...”

**Вядучы 2:**

Вучыўся Ю. Голуб у Горненскай пачатковай школе, затым працягваў вучобу ў Зэльвенскай сярэдняй школе. Вучыўся паспяхова, але, відаць, без асаблівай ахвоты. Любімымі прадметамі былі геаграфія, гісторыя, астраномія. Яшчэ ў школе пачаў пісаць артыкулы ў газеты. А ў 1963 годзе ў раённай газеце з'яўляецца яго першы верш “Хто не працуе...”.

**Вядучы 1:**

У 1965 годзе Юрка Голуб стаў студэнтам-філолагам Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Леніна і быў ад гэтага шчасця, як кажуць на сёмым небе. І было ад чаго. На філфаку тады выкладалі вядомыя паэты і пісьменнікі Н. Гілевіч, А. Лойка, І. Навуменка, Дз. Бугаёў, С. Александровіч, а вучыліся Г. Дзмітрыеў, Л. Дайнека, С. Законнікаў, К. Камейша.

**Вядучы 2:**

Гады вучобы праходзілі цікава і пладатворна. Ю. Голуб удзельнічаў у рабоце універсітэцкага літаб'яднання “Узлёт” пад кіраўніцтвам А. Лойкі. Яго вершы друкаваліся ў часопісах “Полымя” і “Маладосць”, ва ўсіх выданнях беларускага “Дня паэзіі”, у калектыўных паэтычных зборніках БДУ і Гамбургскага педагагічнага інстытута.

**Вядучы 1:**

Прачытаўшы часопісную падборку вершаў Юркі Голуба і яго літаратурных пагодкаў, Ларыса Геніюш 15 снежня 1966 года напісала ліст, ад якога ў дзевятнаццацігадовага аўтара магла закружыцца галава: “Дарагі Галубок, харошы! Сёння прыйшло “Полымя” і я ледзь бачу пісаць... ты гэта што прыдумаў, зубраня дарагое? Заплюшчваю вочы і здаецца мне, што гэта гаворыць зямля мая і адыходзіць з сэрца ўпарты боль і ноша цярпенняў старых становіцца – неіснуючай. Дзякуй табе, зубранё, крылатае і надзейнае! Перадай ад мяне словы шчырага прызнання і вялікай радасці сябрам тваім па пяру. Вершы Вашыя з сэрцаў Вашых, а сэрцы, як бачна, жывуць і крынічаць з роднай зямлі. Вітаю і бласлаўляю на магутную сілу Ваш

першы, вялікі голас зубрыны! Жадаю Вам патрасаць ім пушчы і сэрцы і пяяць Беларусі па праву неадродных сыноў Зямлі гэтай! Жадаю Вам шляхоў лягчэйшых і яснейшых і сілаў, якія перамагаюць зло! Трымайцеся, дарагія! Застаюся з вялікай надзеяй на Вас, з каханнем і вераю ў Вас. Ваша: паэтка, змагар, вязень і друг".

**Вядучы 2:**

Першая кніга Ю. Голуба "Гром на зялёнае голле" ўбачыла свет у 1969 годзе, калі ён быў яшчэ студэнтам чацвёртага курса. Вось першы верш з гэтага зборніка:

*Зноў галубіныя веранды.*
*Дажджы святлеюць, як сады.*
*Дваццаты год.*
*Ужо не рана.*
*Са мной, развага, пасядзі.*

*Жыццё раскладзена на трэці:*
*Адна... Яшчэ... Яшчэ адна.*
*Хачу старонкіператрэсці,*
*Дзе жылка кожная відна.*

*Што зроблена – не перакрэсліць,*
*Не разламаць, як футарал.*
*І пада мной трывае крэсла,*
*Як кроквы дзесь на хутарах.*

*І, заміраючы крывінкай,*
*Блукае думка сярод слоў:*
*А вы душой не пакрывілі?*
*Не праклінალі рамяство?..*
*Павекі цяжкія ў века.*
*Бяссоння доўгія брады.*

*Мой век –*
*Мой скарб.*
*Знімаю века*
*Тваёй схаванай дабраты.*

**Вядучы 1:**

Закончыўшы філфак БДУ ў 1970 годзе, Юрка Голуб жыве і працуе ў Гродна. Неўзабаве выходзяць яго зборнікі паэзіі “Дрэва навальніцы” (1973 г.), “Векапомнае поле” (1976 г.), “Помню пра цябе” (1983 г.). Апошняя з іх – чацвёртая кніга паэта, што само па сабе прадугледжвае творчую спеласць. Ужо дарэчы падвесці вынік. Гэта разумее і сам аўтар:

*Дачакаемся гэтай пары:*
*На дыбы ўзляціць завіруха,*
*І заўважыш у белым бары*
*І ў сабе незаўчасныя зрухі.*

*На сцяжыну, што сам пратаптаў,*
*Азірацца няўзнак, можа рана?*
*Толькі ўсё ж азірнецца ратай,*
*Ці па-добраму поле ўзарана.*

*Найскладаней падумаць, што час*
*Адыходзіць. А ты не ўзыходзіш.*
*Ды скажы сабе сам без прыкрас:*
*“Паблазнерылі, браце, - і годзе!”*

*А іначай дык пойдуць на злом*
*І гады па пустому іржышчу.*
*І ля скроні, дзе жылка вузлом,*
*Сівізна безгалоса засвішча.*

***(“Трывожнае”)***

**Вядучы 2:**

Юрка Голуб у сваёй паэзіі ідзе ад жыцця. Яго лірычны герой – гэта і рамантык, што “заходзіць весела ў вагон адлегласць браць на пробу”, і дзед, які “верыў: лепшы дзень чакае, і ведаў: горшы дзень – нябыт”, і салдат, у якога наперадзе “як бяссмерце – жыццё”, і зямляк-энергетык у далёкім таёжным краі. Паэт умее стварыць у сваіх вершах атмасферу непадробнага жыццялюбства, якое ідзе ад паўнаты жыцця, яго важкасці.

**Вядучы 2:**

Калі ў сям'і падрастала дачка Ксеня, Юрый Уладзіміравіч выдаў невялікі зборнік вершаў для дзяцей "У бары грыбы бяры" (1986 г.). Потым выходзяць з друку яго кнігі вершаў "Сын небасхілу" (1989 г.), "Поруч з даждом" (2001 г.), "Зажураны камень" (2002 г.).

**Вядучы 1:**

За заслугі ў паэзіі Юрый Уладзіміравіч узнагароджаны ў 2000 годзе літаратурнай прэміяй імя Аркадзя Куляшова.

Зборнікі "Поруч з даждом" (2001) і "Зажураны камень" (2002) засведчылі, што паэт знаходзіцца на піку свайго паэтычнага майстэрства. І з гэтай вяршыні яму адкрываюцца не толькі панарамныя краявіды, але і такія "дробязі", што так балюча-шчымліва кранаюць сваёй абвостранасцю і вытанчанасцю пачуццяў:

*Спадчынны край на зары*
*І жылкаю мне далягае,*
*І з твару падобны да гаю*
*Спадчынны край на зары.*
*Ці будзе дарога даўгая,*
*Ці стану, як воблак, старым,*
*Спадчынны край на зары*
*І жылкаю мне далягае.*

**Вядучы 2:**

У 2004 годзе выйшла новая кніга паэзіі нашага вядомага аўтара-земляка "Брама зімы". Гэта кніга вопытнага паэта, майстра можа задаволіць самы патрабавальны густ сучасніка. Кніжку трэба чытаць не спяшаючыся, каб смакаваць паэтавы метафары, якія плывуць-пераліваюцца дзівоснымі адценнямі жыцця.

**Вядучы 1:**

На цяперашні час апошнія яго кнігі – гэта кніга паэзіі "Багра", выдадзеная выдавецтвам "Беларускі кнігазбор" і кніга

на польскай мове “Znad Niemenskich Stron”, выдадзеная ў Беластоку (пераклад вершаў з кнігі “Поруч з дажджом”). Выдадзены кнігі ў 2006 годзе.

**Вядучы 2:**

Слова для Юркі Голуба не проста падручны матэрыял для мастацкага выказвання сваіх думак і пачуццяў, але і самадастатковая сутнасць усіх зямных повязяў пад небам. Яно жывое і неаднароднае нават унутры самога сябе. У яго ёсць свае адценні, падтэксты і рознасэнсы. Яно ёсць перадумовай, а мо ўжо і самой прадмовай да пошуку патаемнай ісціны...

**Вядучы 1:**

Ю. Голуб – паэт сучасны і ў сваёй творчай манеры, і ў тэматыцы. Але яго сённяшні дзень абапіраецца на мінулы, на гісторыю народа і яго культуру. Пра гэта гавораць многія вершы паэта, такія як “Радкі пра Гродна”, “Ля дарог, не стаптаных брыдою”, “Цётка ў Закапанэ” і многія іншыя.

Ад кніжкі да кніжкі паэт ідзе нялёгкім шляхам, дзе ёсць і поспех, і свае няўдачы, але ёсць на гэтым шляху і агульнае: чэснасць, сумленнасць, праўдзівасць пачуцця. Ён паэт з акрэсленай грамадзянскай пазіцыяй, можа зайздросна здзівіць смелай свежай метафарай, прывабіць арыгінальнай формай, здольнасцю трапна і сціпла выказаць важкую думку.

**Вядучы 2:**

Віктар Ярац прысвяціў Юрку Голубу верш, які называецца “На фінішы лета”:

*Маланкі з ліўнем спёку разагналі*
*за ноч адну.*
*Смагою ранкам ахрысцілі далі*
*ціш – цішыню.*
*На лісці кроплі, нібы золкі высеў*
*хмурын густых.*
*Вандруе позірк у астылых высях*
*вачэй чыіх?*
*Пасля грымот аблажных на світанні*
*глытні між рос*

*ад айсбергаў высозных прывітанні –*
*глыток нябёс.*
*Паслухай радасць дрэў ( адолець рваўся*
*іх злы віхор).*
*Зноў музыку і Моцарта і Брамса*
*стварай, прастор.*
*Дыханне рэк на золку ў вокны шчодра,*
*як звон, плыві.*
*Яшчэ жывуць надзей зямных акорды –*
*і свет жывы.*

*На працягу мерапрыемства выкарыстоўваецца беларуская народная ці эстрадная музыка, песні ў выкананні ансамбляў "Сябры", "Песняры".*

## "Паэтычны шлях Юркі Голуба"

### ВІКТАРЫНА

**1. Дзе і калі нарадзіўся Юрка Голуб?**

***(У вёсцы Горна Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці, 20 кастрычніка 1947 года)***

**2. У якіх навучальных установах займаўся будучы паэт?**

***(Горненская пачатковая школа (1954-1958 гг., Зэльвенская сярэдняя школа (1958-1965 гг., філфак БДУ імя Леніна (1965-1970 гг.)***

**3. Дзе быў надрукаваны першы верш паэта і як ён называўся?**

***(У раённай газеце "Знамя Октября" (1963 г.), "Хто не працуе...")***

**4. Назавіце першы зборнік вершаў Ю. Голуба. Калі ён быў надрукаваны?**

***(Першы зборнік вершаў "Гром на зялёнае голле" выйшаў у 1969 годзе ў выдавецтве "Беларусь")***

**5. Якія яшчэ зборнікі паэта ўбачылі свет?**

***("Дрэва навальніцы" (1973 г.), "Векапомнае поле" (1976 г.), "Помню пра цябе" (1983 г.), "Сын небасхілу" (1989 г.), "Поруч з дажджом" (2001 г.), "Зажураны камень" (2002 г.), "Брама зімы" (2004 г.), "Багра" (2006 г.)).***

**6. Якія творы Ю.Голуб напісаў для дзяцей?**

***(Зборнік вершаў "У бары грыбы бяры")***

**7. Які зборнік вершаў і на якую мову быў перакладзены? Дзе і ў якім годзе быў выдадзены?**

(*Зборнік вершаў "Поруч з дажджом" быў перакладзены на польскую мову і выйшаў у Беластоку пад назвай "Znad Niemenskich Stron", у 2006 г.)*

**8. За што і ў якім годзе Ю. Голуб быў удастоены літаратурнай прэміі СП Беларусі імя А. Куляшова?**

(*За заслугі ў паэзіі ў 2000 годзе*)

**9. На якіх мовах, акрамя беларускай, друкаваліся вершы Юркі Голуба?**

(*Вершы Ю. Голуба друкаваліся на рускай, украінскай, літоўскай, польскай, нямецкай, славацкай мовах*)

## "Выспяванае слова"

### (Бібліяграфічны агляд выданняў Юркі Голуба)

**І ляціць Радзіма без канца.**
**І фіранка часу варухнецца,**
**Каб угледзець твар свайго ганца,**
**Не спытаўшы – як ганец завецца.**

*(Ю.Голуб)*

Але, калі ўявіць, што гэтым ганцом будзе паэт, і калі яшчэ больш дакладней, што гэтым паэтам будзе Юрка Голуб, - то тады абавязкова не толькі будзе ўгледжаны твар, але названа імя. І не толькі ў літаратуры. Адметнасць паэзіі Юркі Голуба была заўважана яшчэ ў 60-х. Блаславулёны самой Ларысай Геніюш, ён адразу "прымусіў" крытыку прызнаць, што "яго погляд на свет не зблытаеш ні з чыім іншым" (Ф. Яфімаў).

Магчыма, патрабавальнасць творцы да свайго ўласнага паэтычнага слова з'явілася прычынай таго, што кніг было выдадзена няшмат. "Не адношуся да аўтараў, якія фарсіруюць у сабе імкненне пісаць у любое надвор'е, з любой нагоды, у любых абставінах – прызнаецца паэт. – І дарадцам тут сам па сабе становіцца спрактыкаваны Гётэ: "Лепш ужо забаўляцца або спаць у непрадуктыўныя дні і гадзіны, чым старацца з сябе выціснуць тое, што потым ніякай радасці табе не дасць".

Але трэба прызнаць, што кожная з выдадзеных кніг не засталася па-за ўвагай крытыкі. Пра паэзію Ю. Голуба пісалі Р. Бярозкін, А. Пысін, А. Лойка, В. Коўтун, Р. Баравікова,

В. Ярац і інш. Пры гэтым адзначалі высокаразвітую тэхніку верша, гнуткасць інтанацый, лёгкасць натуральнай размовы, непасрэднасць паэтычнага ўспрымання.

Ю. Голубу пашанцавала на пачатку творчай дарогі на добрых людзей, вопытных і патрабавальных настаўнікаў. Першыя спробы пяра Ю. Голуба, тады яшчэ школьніка, ухваліла Ларыса Геніюш. А яго першая кніга “Гром на зялёнае голле”, якая выйшла ў выдавецтве “Беларусь” у 1969 годзе, калі аўтар яшчэ вучыўся на чацвёртым курсе аддзялення беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, была адрэдагавана на грамадскіх пачатках самім Анатолем Вялюгіным. Ужо тут выявіліся лепшыя рысы творчай манеры маладога паэта – выклік і панылай апісальнасці, штампам і бясколернай агульшчыне, дзёрзкае і аптымістычнае адчуванне рэальнасці, у якой ён не толькі заўважае праявы і прыкметы сучаснасці, але і памяццю, перададзенай у спадчыну людзьмі старэйшага ўзросту, звяртаецца да дзён мінулых.

*І не шкада, што пастарэлі*
*Зачыны одаў і прамоў.*
*Было ж сузор’е перамог –*
*Салюты падаюць на стрэхі!*

*Рука разгублена лавіла*
*На шчасце знічку ў далонь.*
*Вяртала родзічаў здалёк*
*Абдымкаў вольная лавіна.*

*Дыміла горача пад крокам*
*Папараў парная ралля.*
*І нібы радасны раяль,*
*Сляпілі клавішамі кроквы.*

*Хавалі,*
*Сеялі,*
*Радзілі*
*Пад гул уквечаных сталіц*
*Сляза прапальвае сталы.*
*Жыты калосяцца Радзімы.*

*Над вечнаю салдацкай зоркай*
*Гудзе ў галлі зялёны гром.*
*Бяда не пройдзе напралом,*
*Як той свінец праз гімнасцёрку.*

***(“Перамога”)***

Наступны зборнік вершаў Ю. Голуба выйшаў у 1973 годзе пад назвай “Дрэва навальніцы”. З захапленнем адгукнуўся на выхад кнігі такі патрабавальны паэт, як Аляксей Пысін. Ён прадракаў маладому паэту бліскучую творчую будучыню, бліскучае ўзыходжанне на паэтычны алімп, а таксама выдатныя адкрыцці і знаходкі на залатым паэтычным прыіску. У гэтым зборніку аўтар робіць рэкагнасцыроўку мясцовасці, наносіць на сваю карту кожную мішэнь, кожны кусцік, пазначае іх сваімі ўласнымі знакамі і пачынае весці разведку боем. Калі гаворка ідзе пра сучаснае, верш нагадвае сабой бліскаўку, што западае ў памяць чытача. Той верш, дзе гаворыцца пра мінулае і на ваенную тэму, можна параўнаць з мемарыяльнай дошкай, за якой стаіць жыццё і біяграфія таго, каму яна адкрыта, прымацавана да сцяны гісторыі:

*Хлопцы падаюць ніцма*
*На крывавых дакосах.*
*...Гэта ўжо не прысніцца,*
*Падпалкоўнік Твардоўскі.*

Пасля выхаду гэтай кнігі ўсім было зразумела, што ў паэзію ідзе арыгінальны паэт, мастак слова.

*Векапомнае поле.*
*Папар.*
*Серабраная постаць бярозы.*
*Наплывае паволі на твар*
*Палявы неразгаданы роздым.*

***(“Поле”)***

Трэцяя кніга паэта выйшла з друку ў 1976 годзе пад назвай “Векапомнае поле”. У зборнік уключаны вершы за два гады (1974-1975). Наша радзінная зямля, якая нясе ў сабе балючую памяць пра барозны варожых танкавых гусеніц, а цяпер, абходжаная людскімі рукамі, дае чалавеку сілу і хлеб.

Кніга вершаў “Помню пра цябе” ўбачыла свет у 1983 годзе. Тут Ю. Голуб застаецца верным сваім вытокам – непаўторнай Бацькаўшчыне, глыбінным карэнням чалавечай душы, усяму, што створана людскім розумам і рукамі. Гэты зборнік напачатку робіць уражанне нейкай стракатасці: і тэматычнай, і жанравай. А потым становіцца зразумела, што гэта ад аўтарскага імкнення пашырыць сэнсавыя і выяўленчыя межы свайго верша. У кнізе радуе шырата жанравага дыяпазону, намаганні паэта ў распрацоўцы такіх форм вершаскладання, як трыялет і верлібер. Прадстаўлена ў гэтым зборніку і баладная лірыка (“Балада залатой пчалы”, “Балада цішыні”). Кніга вершаў гаворыць пра творчую спеласць паэта. Ужо дарэчы падвесці вынік. Гэта разумее і сам аўтар:

*На сцяжынку, што сам пратаптаў,*
*Азірацца няўзнак, можа, рана?*
*Толькі ўсё ж азірнецца ратай,*
*Ці па-добраму поле ўзарана.*

***(“Трывожнае”)***

Нямала глыбокіх, па-мастацку напісаных вершаў рассыпана па старонках зборніка “Сын небасхілу”, які выйшаў у выдавецтве “Мастацкая літаратура” ў 1989 годзе. Вершы з гэтага зборніка нагадваюць грыбныя нерушы, дапаўшы да якіх, радуешся душой і сэрцам. Паэт эксперыментуе, як бы спрабуе слова на гнуткасць і трываласць, стараецца паставіць у такі рад, што яно само ўзгараецца новым святлом. Вершы напісаны на высокім прафесійным ўзроўні, з багатай фантазіяй.

*Ноч надзела дарозе шоры.*
*Вісне ўстойліва мокры ліст.*
*Знервавана ўздрыгне ліс*
*У пясчанай глухой каморы.*

*Зноў пасталі агні далёка.*
*У выбоінах след намок.*
*Спрацавана ляглі на мох*
*Карані –*
*вякоў далакопы.*
*Дубу ў чуб уплялася знічка.*

*Сон-трава.*
*Сон-дарога.*
*Сон.*
*Змрок раскрыліў свой парасон,*
*Шлях да вечнасці невялічкі.*

***(“Змрок у лесе”)***

Вершам “Зямля”, прадстаўленым як факсіміле аўтарскага рукапісу, пачынаецца новая кніга вершаў Ю. Голуба “Поруч з даждом”, выдадзеная ў 2001 годзе.

*Ідуць галасы навобмацак.*
*Пра нешта муры маўчаць.*
*Зусцішна нават воблаку*
*Над існым шляхам мяча.*

*Травее каменны рэзрух*
*На крэўным напрамку тым.*
*Жылу бусел парэзаў,*
*І рану бінтуе дым.*

*Мусіць, і нас не будзе.*
*Над голасам стане груд.*
*Хаця мы раслі пры брудзе,*
*Нас не спаганіў бруд.*

*Поле. І ў полі зроку*
*Скібамі час залёг.*
*Далей не ступлю ні кроку –*
*Тут супыніўся Бог.*

***(“Зямля”)***

У кнігу ўключаны вершы за пяць гадоў (1996-2000). У невялічкай анатацыі пазначана: "Рух чалавечай душы ў атачэнні самых розных зямных праяў і здарэнняў – гэта маральны і існы змест зборніка. Радкі паэта бяруць пачатак у першую чаргу ў духоўных скарбах людскасці і скіраваны да ўсіх, хто жыве поруч". Зборнік складаецца з трох безназоўных раздзелаў, хоць у гэтай кнізе няма ні аднаго безназоўнага верша

(а іх усяго – 144). Яшчэ на пачатку свайго творчага шляху Голуб выявіў схільнасць да фразы жывапіснай, зрокава маляўнічай, багатай на колеры і іх адценні. Па манеры пісьма, якая шмат у чым – вынік уласнага светаадчування і асабістага ўспрыняцця жыцця, ён блізкі да імпрэсіяністычнай манеры Гарсія Лоркі і Рыгора Барадуліна, творчасцю якіх захапляўся яшчэ ў студэнцкія гады.

Мініяцюрна-лаканічныя трыялеты – яшчэ адзін бок паэзіі Юркі Голуба. У 2002 годзе выйшаў яго зборнік трыялетаў "Зажураны камень", як прызнаецца ў прадмове сам аўтар, - "пад уладным заклікам Максіма Багдановіча". У беларускай літаратуры трыялеты пісалі Я. Сіпакоў, Хв. Чэрня, А. Барскі і інш., але зборнік "у адной вершаванай раме" – трыялеце – выдадзены ўпершыню. Да гэтай – вытанчанай знешне і філасофскай знутры – вершаванай формы Ю. Голуб меў схільнасць і раней. У яго трыялетах, як і ў цэлым у паэзіі, пульсуюць час і памяць, роздум і высокія памкненні душы. Аўтару ўласціва "схапіць" паэтычнае імгненне і высвеціць яго найбольш значнай і адметнай гранню. Зборнік склалі тры раздзелы, тры грані быцця, тры грані акрэсленасці абсягу, словам – тры грані таго "філасофскага" камня, які паэт назваў для сябе "зажураным". Першай з трох быццёва-метафарычных граняў "Зажуранага камня" ёсць грань святла і волі. Святло струменіцца з кожнага вершаванага радка.

*Пад бляскам месяца муры*
*Маўчаць шчымліва, як афорты.*
*І апрануты шэрым кортам*
*Пад бляскам месяца муры.*
*І зачыняе сумна фортку*
*Рукой дрыжачаю стары.*
*Пад бляскам месяца муры*
*Маўчаць шчымліва, як афорты.*

***("Горад")***

Другі цыкл зборніка, наадварот, апрадмечаны. Яго зрокавая прадметнасць выяўлена самым непасрэдным чынам праз назвы: "Ранак", "Зоры", "Таполя", "Чаромха", "Завея" – усё тое, што можа ўспрымацца органамі пачуццяў. А таму ён яшчэ і пачуццёвы.

Трэцяя грань зборніка - мроі, лятункі-летуценні, навеяныя тымі ці іншымі прыроднымі з’явамі ці асабістымі ўспамінамі.

*Над люстэркам глыбокай вады*
*Наша шчасце з табой вечарэе.*
*Толькі твар твой зусім не старэе*
*Над люстэркам глыбокай вады.*
*Нас з табою да скону сагрэе*
*Шэпт гарачы і шэпт малады.*
*Над люстэркам глыбокай вады*
*Наша шчасце з табой вечарэе.*

***(“Маладосць”)***

З гадамі эмацыянальнасць у вершах Ю. Голуба становіцца стрыманай, слабее мажорны тон, але незвычайная аўтарская фантазія, якая ўмее паэтычна збліжаць далёкія па сэнсу рэчы і з’явы, толькі мацнее, зноў і зноў выбухаючы адкрыццямі новага ў вядомым і звычайным. Гэта пацвярджае і кніга паэзіі “Брама зімы”. Кніга выйшла з друку ў 2004 годзе. Калі ў ранняй лірыцы Ю. Голуба паэтызаваліся суладнасць, гармонія ўсяго жывога на зямлі, то зараз цікавяць самыя розныя, у тым ліку працілеглыя ўласцівасці жыцця. Адсюль – такая разнастайнасць лірычнага зместу ў зборніку: стыхія жывых пачуццяў, хітраватая ўсмешка, сардэчнае пачуццё, беларускае жыццё, балючы драматызм стратаў. Пачуццём стратаў прасякнута невялікая паэма “Знакі”, у якой раскрываецца вобраз Беларусі ў яе гістарычных, маральна-псіхалагічных, грамадзянскіх аспектах жыцця, у асобах яе лепшых людзей. Зборнік “Брама зімы” – адна з самых прыкметных кніг у сучаснай беларускай паэзіі.

Напрыканцы 2006 года ў мінскім выдавецтве “Беларускі кнігазбор” выйшла ў свет новая паэтычная кніга Ю. Голуба “Багра”. Багровы, восеньскі ўзрост аўтара, зусім не перашкаджае творчаму натхненню. Пад вокладкай новай кнігі сабраны апошнія вершы паэта і паэма “Заснежаны сшытак”. У анатацыі да кнігі пазначана, што “вершы абгрунтаваны пранізлівай думкай, насычаны адмысловай метафарай, выкананы выразным і дакладным радком майстра з адметным

почыркам і светапоглядам”. Так, філасофскай думкай пра няспыннасць жыцця, гістарычную пераемнасць у часе гавораць радкі верша “Краявід”:

*З пясчанаю плешкай курган.*
*Завітая пчоламі дзічка.*
*Пасталі аблокі круга,*
*Каб краю бяссмерценазычыць...*

***(“Краявід”)***

Сапраўдных паэтаў заўсёды меней, чым літаратурных крытыкаў, біёграфаў. Да ліку першых менавіта і належыць Юрка Голуб – паэт, які жыве ля Нёмана, побач з намі, у непарыўнасці са сваім часам і людзьмі старажытнага горада Гродна. Землякі чакаюць новых твораў Юрыя Уладзіміравіча, жадаюць яму творчага плёну і здароўя.